# ВАНДРОЎКА АД ГУЧЫ

**У сярэднім слове загалоўка можна проста пераставіць месцамі літаркі — і атрымаецца тое самае, толькі ўжо не так прэтэнцыёзна. А нам якраз прэтэнцыёзнасць тут патрэбна. Бо падарожжа не абы-куды.**

У НАШАЙ кухні на сцяне вісіць талерка з выявай палаца Сапегаў. Той найбольш знакамітай іх рэзідэнцыі, што ў Ружанах. Пабудаванай замест папярэдняй, што ад Гучы. Талерка сабе вісіць, а нам клопат: выбіраючыся ў доўгачаканае і з навуковай педантычнасцю распланаванае падарожжа-экспедыцыю ў наднёманскія вёскі Паніжаны, Горны, Глядавічы — на пошукі слядоў вядзьмарак і лекарак, якія жылі там паўтара стагоддзя таму, і загадкавых раслінак пад экзатычнымі назвамі зязюльчыны ручкі, казіныя бароды і шчасце, — мы чэрцім свой маршрут праз Ружаны, дзе ўжо былі і ўсё бачылі. І нават, між іншым, у тамтэйшыя сутарэнні спрабавалі спускацца.

Хто б мог падумаць, што вяртацца на месцы ранейшых вандровак нас можа прымусіць насценная талерка — звычайная парцэлянка з архітэктурнай выявай. Але так ёсць: гэта яна, купленая некалькі гадоў таму і перавешаная ў кухню пасля рамонту, сагітавала нас на новы візіт у Ружаны, зноў да Сапегаў. Ну, і да Гучы ўжо заадно.



У сенцы, што праглядаюцца скрозь арку брамы, уваходзілі некалі выключна магнаты.

БЫЎ, значыць, такі архітэктар. Зваўся Санці, а Гучы — прозвішча, з дадаткам Ф'ярэнціна. Палац у Ружанах, створаны талентам Гучы, ніяк не магчыма нам сёння ўбачыць (бо разбурылі яго, а пазней на свой манер пераўзвялі розныя пепельманы ды нейманы, ды іншыя саксонскія муляры, якіх у ВКЛ панапрывозіў Аўгуст II), але ўявіць — вельмі лёгка. У любым выпадку палац па праекце Санці Гучы Ф'ярэнціна выглядаў на свой час як архітэктурная звышнавіна і заходзіў на архітэктурнае поле яшчэ не «замкнёным» (то бок, у літаральным сэнсе замкам, са схаваным ад вачэй дваром), а ўрачыста разгорнутым, «замкам навыварат», з шырока прасцёртымі «крыламі» і парадным уездам навідавоку.



У 1875-м. Так бачыў Орда.

## *Буркатанне сварлівай цётачкі*

Рэчы абсалютна не складаныя не толькі на першы, але і на другі, трэці, пяты, сто пяты пагляд; дзеянні, якія не патрабуюць не тое што асаблівых, а нават самых звычайных намаганняў; ідэі настолькі відавочна прыцягальныя, што дзіву трэба давацца, чаму дагэтуль не рэалізаваныя, — усё гэта, як будзённая практыка пераконвае, ёсць нешта немагчымае-неверагоднае. Непад'ёмнае, неабдымнае. Фантастычнае. Як на Марс паляцець. Хіба складана, ведаючы, што маці Марка Шагала трымала бакалейную лаўку, арганізаваць такую лаўку пры яго віцебскім доме-музеі і пасадзіць гандляваць у ёй жывую Фейгэ-Ітэ? (Апрануць у Фейгэ-Ітэ гандлярку сувенірамі і квіткамі? Або выдаваць за яе — гаспадыню! — экскурсаводку?) Кошт пытання — адрэз на сукенку. Вынік — айчынны турызм на ўзровень вышэй існуючага. Хіба доўга выкінуць з Нясвіжскай ратушы макет пісарчука і пасадзіць пісарчука сапраўднага, апранутага ў той жа строй? Тут кошт пытання — зарплата. Але хіба шкада яе выплачваць за сумленную працу?..

А пры ружанскіх развалінах я даўно б пачала прадаваць сапяжанку.

Велічны і па сёння, і ў напаўразбураным стане пампезны, цэнтр як былой, так і сённяшняй архітэктурнай кампазіцыі называецца ўражліва проста. На дзіва проста. Як бакоўка ў сялянскай хаце — сенцы. Але ў гэтыя сенцы ўваходзілі спрэс магнаты. Бо гаспадарамі сенцаў былі Сапегі. Аблокі над гэтым мястэчкам плылі тады іншыя — бо выліліся з тых часоў мільярды снапоў дажджоў, халодных і цёплых, занудлівых, спорых і абнадзейвальных. Але сонца ў сапегаўскія вокны зазірала тое самае, якое свеціць нам цяпер па дарозе, прымушаючы апускаць сонцаахоўныя брылі нашага «шатла».

Пасля Льва тут панавала шмат іншых Сапегаў. І калі б носьбіты гэтага прозвішча былі трошкі менш заліхвацкія ды амбіцыйныя, трошкі больш сціплыя і памяркоўныя, калі б не дражнілі крыўдлівую шляхту, калі б не ваявала яна з імі, калі б не разбурыла той палац па праекце Гучы... Але ў гісторыі заўсёды адбываецца тое, што адбываецца. У канцы XVI стагоддзя шляхта разбурыла збудаванне Гучы, ваюючы з Сапегамі. Замак-палац пасля зноў будаваўся. Ужо ў навейшым стылі ракако. Тое, што мы бачым цяпер, — вынік працы Яна Самуэля Бекера, прыдворнага архітэктара новых, наступных Сапегаў — ужо з XVIII стагоддзя. Калі не лічыць узноўленых брамы і флігеля — напаўразбураны вынік. Бекер збудаваў тут і тэатр на сем куліс і дванаццаць дзевяць ложаў (у два ярусы, па чатырнаццаць у кожным і з каралеўскай ложай у верхнім ярусе, пасярэдзіне), і канцылярыю наноў, і кардэгардыю, але шмат што з запланаванага не збудаваў. Бо Рэч Паспалітую падзялілі, бо адзін Сапега-гаспадар памёр, а другі — наступны, — не маючы такой хваткі, узяў ды аддаў палац суконшчыкам у арэнду.

Не верыцца, але вось тут, у гэтай велічнай разрусе, яшчэ ў 1944-м працавала ткацкая фабрыка. Немцы, адступаючы, яе спалілі. І толькі ў 1965-м тут спыніўся выраб кафлі. Самай звычайнай, без выявы герба «Ліс».

Але сапегаўскую кафлю тут можна бачыць: яна, малайчынка, схавалася і чакала раскопак. І так сябе захавала, што здолела стаць экспанатам музея, размешчанага ў флігелі каля брамы. Тут жа, у флігелі, можна бачыць і посуд, якім у гэтым «доме» карысталіся (бачыць яго — усё роўна што быць сведкай візіту сюды ў 1644-м Уладзіслава IV з Цэцыліяй-Рэнатай Аўстрыйскай. Бо як прымалі іх, караля з каралеваю і дваром, «што прыбылі ў Ружану з Жыровіц», дык, кажуць, ажно дзевяць дзён, не перастаючы, частавалі), і сапегаўскі гузік (належаў Аляксандру Сапегу, які памёр у 1793-м, і значыць, гузіку, трэба лічыць, не менш як дзвесце з «гакам»!), і... падлогу старой канцылярыі! Прама пад шклом, пад падлогай навейшага ўзроўню.



Так выглядала брама ў 1920-х.

## *Рамантыкам*



Што ў ружанскім палацы найбольш нас уразіла? Ну, акрамя самога палаца, бо ён жа па-за канкурэнцыяй. Памятаючы пра насценную талерку, я сказала б, што сувенірная лаўка. Але... У адным з залаў музея размешчаны вялізны макет: якім палац быў і меўся быць далей, калі б усё інакш склалася. Гэтае пап'е-машэ накладаецца ва ўяўленні на каменны цуд за вокнамі музея — і ты лёгка-лёгка прымаеш усё як ёсць: вось ён, у зале музея, палац аднаўлены, а там, за вокнамі, жывая даўніна. «Два ў адным», так бы мовіць. І табе не хочацца нічога ўзнаўляць і некага падбухторваць на гэтую, далібог, спрэчную справу. Ты проста ганарышся тым, што і ў цябе, тваёй краіны ёсць свой... ну, амаль што калізей.

* * *

У ВАНДРОЎКУ нас можа паклікаць што заўгодна: стомленасць ад штодзённай працы і прага новых уражанняў, жаданне весці «падарожны» блог і абавязак бацькоў паказваць дзецям гістарычна-культурную спадчыну, унутраны патрыятызм і паказная цікаўнасць... А бывае, што ў вандроўку кліча набытая раней памятка, звычайны папулярны сувенір. Пераглядзіце, спадарства, свае магнічікі. Можа, там, дзе вы ўжо былі, вас яшчэ нешта чакае?

Падарожнічала
Святлана ДЗЯНІСАВА.

## ДАЛЁКА І БЛІЗКА



16 ліпеня ў пасёлку Кільмезь у Кіраўскай вобласці Расіі праводзіцца «Вяцкі лапаць», а на рацэ Рэйн у Германіі ў той самы час — «Кёльнер ліхтэр», фестываль феерверкаў. Таму, хто не ўмее быць адначасова тут і там, прапануецца трэцяе — Феста дэль Рэдэнторэ ў Венецыі, свята ў гонар збавіцеля ад чумы.

**Галоўны фэст музыкі і тэхналогій называецца Alfa Future People. Праводзіцца 22—24 ліпеня. Хэдлайнер — Армін ван Бюурэн, «ікона транс-музыкі». Частку тэхналогій запаўняюць розныя звышнавацыйныя гаджэты, інтэрактыўныя атракцыёны, шоу робатаў і пляцоўкі высокатэхналагічных кадраў. Калі зацікавіліся, то вам праз тыдзень трэба як-небудзь трапіць у Ніжні Ноўгарад.**



29—31 ліпеня ў Сан-Марына — Дні Сярэднявечча. Кажуць, штогод напрыканцы ліпеня гэты горад пераносіць сябе на стагоддзі назад. І сапраўды варта паглядзець, як гэта можа адбывацца з горадам, які і без таго ўяўляе сабою музей ды яшчэ жыве па Канстытуцыі 1600 года.

**17 ліпеня а дзявятай раніцы каля помніка Пушкіну ў Віцебску чытаецца тысяча вершаў пра гэты горад. Увогуле, быць у бліжэйшыя выхадныя дні ў Віцебску азначае знаходзіцца «На сямі вятрах». Такая назва ў фэсту вулічных мастацтваў, у якім бяруць удзел тэатралы, мастакі і паэты адкуль заўгодна і ў неабмежаванай колькасці.**



Вішнёвае свята ў Глыбокім працягнецца сёлетні чацвёрты раз ад 18 да 23 ліпеня. Конкурс «Вішнёвыя парачкі», вішнёвы сэлфі-квэст, выступленне гурта «Вішнёвы горад», шэсце ад скульптуры «Глыбоцкая вішня» з самой вішнёвай каралевай, гашэнне вішнёвай паштовай маркі, вішнёвы настрой на кулінарных выкамурах... Ці не зашмат? На ўсё не паспееце, але вішань наесціся там можна ўволю.

**Штогадовы «Наш Грунвальд» чакае сёлета сваіх аматараў 23-24 ліпеня. Як заўсёды, у «Дудутках», як і раней, з рыцарскімі баямі, кірмашом і рамеснікамі, старадаўнімі гульнямі і анімацыяй. Танцуюць, спяваюць, гандлююць, страляюць — і ўсё не толькі для весялосці, але і з выхаваўча-адукацыйнымі мэтамі. Хто яшчэ не ведае гісторыю? Вам на «Грунвальд», спадарства. Сустрэнемся.**